КАНФЕРЭНЦЫЯ
НОВАЯ
БЕЛАРУСЬ 2025

Рэзалюцыя дэмакратычных сілаў Беларусі
да Канферэнцыі Новая Беларусь 2025

# Аб супрацьдзеянні гібрыднай агрэсіі з боку Расіі і ідэалагічнай экспансіі «русского мира»

Мы, прадстаўнікі і прадстаўніцы дэмакратычных сілаў Беларусі, разгледзеўшы актуальныя выклікі і пагрозы суверэнітэту, нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці беларускага народа ў кантэксце паглыблення залежнасці Беларусі ад Расійскай Федэрацыі,

***Канстатуем,*** што Расійская Федэрацыя мэтанакіравана ажыццяўляе палітыку гібрыднай агрэсіі супраць Беларусі, скіраваную на падрыў асноватворных сфераў грамадскага жыцця — інфармацыйнай, адукацыйнай, палітычнай, культурнай і рэлігійнай. Асновай гэтай палітыкі з'яўляецца ідэалагічная канцэпцыя так званага «русского мира», якая выкарыстоўваецца як інструмент культурнай і моўнай асіміляцыі, мілітарызацыі адукацыйнай прасторы, прасоўвання імперскіх гістарычных наратываў і аднаўлення савецкіх ідэалагічных канструкцыяў у масавай свядомасці.

***Выказваем глыбокую занепакоенасць*** інстытуцыйным пашырэннем ідэалагічных структураў «русского мира» на тэрыторыі Беларусі. Так, асноўны ідэалагічны інструмент Крамля за мяжой — «Россотрудничество» — мае чатыры афіцыйныя цэнтры ў Беларусі (у Мінску, Брэсце, Гомелі і Гродне), а таксама дадатковую структуру з нявызначаным статусам у Магілёве, адкрытую ў 2023 годзе. Гэта больш, чым у любой іншай краіне. Акрамя таго, у Беларусі дзейнічаюць «Фонд Русский мир» і «Фонд поддержки публичной дипломатии имени Горчакова», якія арганізуюць адукацыйныя, культурныіцкія і прапагандысцкія мерапрыемствы, накіраваныя на распаўсюджанне ідэалогіі «русского мира» і падрыў нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, падтрымліваюць сеткі прарасійскіх блогераў і блогерак і грамадскіх актывістаў і актывістак у Беларусі, што ажыццяўляюць інфармацыйныя атакі супраць беларускіх культурніцкіх ініцыятываў, незалежных медыя і грамадзянскай супольнасці.

***Адзначаем,*** што ва ўмовах ізаляцыі Беларусі ад Еўропы — уплыў Расіі ў сферах культуры, адукацыі, рэлігіі і рэгіянальнага супрацоўніцтва становіцца амаль безальтэрнатыўным.

***Разглядаем гібрыдную агрэсію з боку Расійскай Федэрацыі і суправаджальную ідэалагічную экспансію як адну з найбольш сур'ёзных пагрозаў для незалежнасці Беларусі, захавання яе нацыянальнай ідэнтычнасці і культурнага суверэнітэту. Гэтая пагроза мае стратэгічны характар і патрабуе кансалідацыі дэмакратычных сілаў Беларусі для каардынацыі намаганняў па яе нейтралізацыі, абароне існавання беларускай нацыі і забеспячэнні будучыні краіны як еўрапейскай дэмакратыі.***

***Заяўляем, што Еўрапейская інтэграцыя Беларусі з'яўляецца найбольш эфектыўнай і рэалістычнай альтэрнатывай ідэалагічнай экспансіі «русского мира».*** Ва ўмовах нарастаючага знешняга ціску яна застаецца адзіным дзеяздольным інструментам для ўмацавання суб'ектнасці беларускага грамадства і скарачэння залежнасці ад Расіі. Пашырэнне супрацоўніцтва з еўрапейскімі краінамі ў сферах адукацыі, культуры, медыя і рэгіянальнага

развіцця закладае аснову доўгатэрміновай стабільнасці і стварае ўмовы для дэмакратычнай трансфармацыі краіны.

***У сувязі з гэтым, заклікаем міжнародную супольнасць,*** уключаючы Еўрапейскі Саюз, ЗША і іншыя дэмакратычныя дзяржавы:

– пашыраць умовы для мабільнасці беларусаў і беларусак і каналы камунікацыі з беларускім грамадствам, з мэтай аднаўлення разарваных міжрэгіянальных, адукацыйных, культурных і грамадскіх сувязяў;

– падтрымліваць праекты па інтэграцыі Беларусі ў еўрапейскую інфармацыйную, адукацыйную і культурную прастору, у тым ліку праз абмены, стажыроўкі, супольныя праграмы;

– узмацняць падтрымку праеўрапейскіх інфармацыйных ініцыятываў, а таксама ствараць новыя платформы для асвятлення сітуацыі са свабодай сумлення і свабодай веравызнання ў Беларусі;

***Заклікаем усе дэмакратычныя сілы Беларусі аб'яднаць высілкі дзеля:***

– распрацоўкі комплекснай стратэгіі процідзеяння ідэалагічнай экспансіі «русского мира» ў сферах адукацыі, культуры, медыя, рэлігіі і рэгіянальнага развіцця — з удзелам беларускіх дэмакратычных сілаў, грамадзянскай супольнасці, экспертнай і акадэмічнай супольнасці.

– распрацоўкі і рэалізацыі праграмаў умацавання беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці і сістэмнага супрацьдзеяння ідэалогіі «русского мира» — як на індывідуальным, так і на інстытуцыйным узроўні, як унутры краіны, так і ў эміграцыі;

– садзейнічання пашырэнню мабільнасці для беларускіх грамадзянаў, у тым ліку праз павелічэнне квотаў на візавыя, адукацыйныя і прафесійныя праграмы — асабліва ў галіне акадэмічнай мабільнасці, прафесійнай адукацыі, перападрыхтоўкі і стажыровак;

– пошуку стратэгічнага і эфектыўнага падыходу да супрацьдзеяння расійскай гібрыднай агрэсіі — праз развіццё супрацоўніцтва з украінскімі палітычнымі і грамадскімі структурамі, якія падтрымліваюць незалежнасць Беларусі і яе еўрапейскай будучыні.

***Патрабуем ад дзеючага рэжыму:***

– Спыніць спрыянне ідэалагічнай экспансіі «русского мира» праз палітычную, інфармацыйную, культурную і рэлігійную залежнасць ад Крамля, якая прыводзіць да разбурэння беларускай ідэнтычнасці і навязвання прарасійскага светаўспрымання;

– Спыніць палітыку ізаляцыі Беларусі ад еўрапейскай супольнасці, што праяўляецца ў перашкодах для адкрыцця наземных памежных пераходаў праз штучна створаны мігранцкі крызіс, абмежаванні трансгранічнага

супрацоўніцтва, пераследзе праектаў з удзелам еўрапейскіх партнёраў і стварэнні бар'ераў для камунікацыі паміж беларусамі і народамі суседніх дэмакратычных краінаў.

***Падкрэсліваем,*** што дэмакратычная Беларусь магчымая толькі пры ўмове свядомага і арганізаванага супраціву культурнай, палітычнай і ідэалагічнай інкарпарацыі з боку Расіі, пры ўмове захавання беларускай мовы, гістарычнай памяці, нацыянальнай ідэнтычнасці, а таксама падтрымкі тых асобаў і ініцыятываў, што працягваюць барацьбу за вольную і еўрапейскую будучыню краіны.